УДК 1(476)(091)+141.30

# Традыцыя беларускага тамізму: анталагічны аспект

**Г. І. Клімовіч**, аспирант*

*Артыкул «Традыцыя беларускага тамізму: анталагічны аспект» прысвечана разгляду асноўных прынцыпаў анталогіі тамізму ў творчасці беларускіх каталіцкіх аўтараў XX ст. на прыкладзе прац а. Фабіяна Абрантовіча, а. Яна Тарасевіча, Дамініка Анісько, а. Адама Станкевіча, а. Льва Гарошкі, а. Пятра Татарыновіча, а. Чэслава Сіповіча. У працы прааналізавана выкарыстанне дадзенымі аўтарамі асноватворнага прынцыпу тамізму — разгляд Абсалюту ў якасці супадзення існасці і існавання.*

# Belarusian Tradition of Thomism: Ontological Aspect

**H. I. Klimovich**, Postgraduate Student

*The article is devoted to the review of the main principles of thomistic philosophy in the intellectual heritage of the Belarusian writers (f. Fabian Abrantovich, f. Adam Stankevich, f. Jan Tarasevich, Dominik Anisko, f. Piotr Tatarynovich, f. Cheslav Sipovich, f. Lev Goroshko). Their interpretation of the most important principle of the thomistic ontology — the Absolute as identity of essence and existence — is analyzed.*

Беларуская інтэлектуальная думка XX ст. уяўляе сабой разнастайнае праблемнае поле сутыкнення плыней ідэалізму і матэрыялізму. Апошняму кірунку надавалася багата ўвагі: на тэрыторыі Беларусі шырока прадстаўлены даследаванні, прысвечаныя развіццю школы дыялектычнага матэрыялізму ў якасці пануючай, што было абумоўлена ідэалогіяй і палітыкай часоў СССР. Зусім інакш склалася з ідэалістычным кірункам. Па-за ўвагай навуковых колаў застаецца творчасць аўтараў, якія рэпрэзентавалі ўласныя філасофска-грамадскія погляды ў межах рэлігійнага дыскурсу. Забытымі апынуліся імёны такіх айчынных рэлігійных дзеячаў, як а. Фабіян Абрантовіч, а. Ян Тарасевіч, Дамінік Анісько, а. Адам Станкевіч, а. Тамаш Падзява, а. Леў Гарошка, а. Чэслаў Сіповіч, а. Пётр Татарыновіч, — прадстаўнікоў тамісцкай традыцыі ў беларускай грамадска-філасофскай думцы.

Адсутнасць у межах філасофскага дыскурсу даследаванняў, прысвечаных пазначанай тэматыцы, выклікае неабходнасць аналізу творчай спадчыны дадзеных асоб. Адначасова трэба адзначыць, што анталогія з’яўляецца адной з найбольш важкіх частак тамісцкай філасофіі — апірышчам яе антрапалогіі, гнасеалогіі і сацыяльнай думкі. З гэтага вынікае мэта дадзенага артыкула: рэканструкцыя тамісцкага аспекту анталогіі беларускіх прадстаўнікоў рэлігійна-філасофскай традыцыі.

Адзін з першых аўтараў, у праблемнае поле якога трапіла дадзенае пытанне, — **а. Фабіян Абрантовіч**. Яго пяру належаць працы «Касцёл і навука», «Бог», «Чалавек». У творах падымаецца шэраг пытанняў, у тым ліку і аналіз катэгорыі быцця і Абсалюту. У працы «Бог» аўтар дае класічнае з пункту гледжання філасофіі азначэнне анталогіі ў якасці найагульнейшай тэарэтычнай дысцыпліны, пералічвае яго формы і віды, падкрэслівае ўзаемапранікненне і сувязь філасофіі і іншых навук:

«І філозофія мае некалькі аддзелаў. Але ёсць у ёй найагульнейшы аддзел, каторы займаецца быццём наогул, ці гэтае быццё будзе вечнае, ці часовае, матэрыяльнае, ці духовае, індывідуальнае, ці універсальнае, істнуючае, ці магчымае. Гэтая найагульнейшая, найважнейшая першая філозофія (онтологія, або метафізіка) з аднэй стараны сама карыстаецца з паасобных навук, а з другой стараны дае падставу ўсім іншым навукам, абасноўваючы фундаментальныя законы і думак істнавання ўсякага» [1, с. 20].

Цэнтральны элемент анталогіі а. Фабіяна Абрантовіча — катэгорыя Абсалюту. Ёй прысвечана ўзгаданая раней праца «Бог», якая складаецца з трох частак. Першая разглядае этымалогію паняцця «Бог», другая — праблему існавання, трэцяя — праблему тэадыцэі. Сцвярджаецца, што рэфлексія а. Фабіяна Абрантовіча здзяйсняецца ў межах класічнай тамісцкай традыцыі і фундзіравана наступным палажэннем філасофскай сістэмы Тамаша Аквінскага: Абсалют — акт самаіснавання, крыніца ўсяго існага, у тым ліку тварнага свету. Рэфлексія а. Фабіяна Абрантовіча ажыццяўляецца ў адпаведнасці з афіцыйнай дактрынай неатамізму, доказам чаго з’яўляецца, напрыклад, фіксацыя дадзенага палажэння ў якасці актуальнага ў на-

* Аспірант кафедры філасофіі культуры факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Навуковы кіраўнік — кандыдат філасофскіх навук, дацэнт В. У. Шубара.

ступных трох з «24 тамісцкіх тэзісаў», якія ёсць, як будзе бачна надалей, агульным апірышчам тамісцкай плыні на Беларусі:

«2. Паколькі акт ёсць дасканаласць, ён не абмежаваны нічым, акрамя патэнцыі, якая сама па сабе ёсць магчымасць удасканальвання. Як следства, у любым выпадку, калі акт з'яўляецца чыстым актам, ён існуе ў якасці адзінага і бязмежнага. Але ў выпадку, калі ён шматлікі і канчатковы, ён бярэ пачатак у злучэнні з патэнцыяй.

3. Магчыма, толькі Бог, адзіны і просты, існуе як абсалютнае быццё. Усе астатнія рэчы, якія ўдзельнічаюць у быцці, маюць прыроду, у якой іх быццё абмежавана, складаюцца з існасці і існавання як асобных прынцыпаў.

4. Рэч клічуць быццём па прычыне быцця (esse). Бог і твор не называюцца быццём ні сугучна ні двусэнсоўна, але па аналогіі назвы і суразмернасці» [2].

У вышэй адзначаным творы «Бог» а. Фабіян Абрантовіч вылучае быццё Абсалюту як адзінае самаіснае, падкрэслівае чалавечую існасць як існаванне з дапамогай прэдыкатаў, аналізуе асноўныя формы і віды быцця. Доказам гэтаму могуць служыць наступныя радкі аўтара:

«Яхвэ знача — той, каторы ёсць. Калі з нас каго спытаюць — хто ты, мы не адкажам проста: я ёсць, але кажам: я ёсць такі і такі. Чаму? Бо ў нас паўнаты быцця няма. На свеце ёсць толькі гэта, або гэнае, а ня проста ёсць, быт (сутнасць). А Бог ёсць і толькі Ён адзін ёсць сапраўды ў цэлай паўнаце бытавання, без агранічэння, без пачатку і канца, бо каб меў пачатак або канец, — ня быў-бы ёсць, але быў-бы той, каторы пачаўся, або той, каторы скончыцца. Такімі ёсць усе рэчы, а толькі Бог ёсць. Нядарма, калі Майсей пытаўся Бога, як мае адказаць тым, да каго пойдзе, Бог сказаў: ідзі і кажы, што Цябе паслаў той, каторы ёсць» [1, с. 6].

Пазіцыя разгляду Абсалюту паводле а. Фабіяна Абрантовіча ў якасці самастойнай рэчаіснасці ў адрозненне ад другаснага тварнага свету, якому ён дае існаванне, як ужо адзначалася вышэй, супадае з класічнай тамісцкай трактоўкай быцця ў якасці акта самаіснавання:

«Разбіраючы, паглыбляючы, абрабляючы паняцце, якое стварылі аб Богу розныя народы, навука, філёзофія, асабліва хрысціянская, дайшла да выраблення аб Богу паняцця навуковага. На пытанне, што ёсць Бог, гэтая навука адказвае так: Бог ёсць быццё самаістнае (esse subsistens). Нічога, ніколі і нідзе самаістнага не было, няма і ня будзе, акрамя Бога. Ты, ён і яно не самаістныя, ані сонца, ані зямля, ані зверы, ані духі, ані ўвесь свет разам, бо чаго няма ў складаных часцінах, — няма ў суме іх. А Бог самаістны і дзеля таго да Бога ня можна прыкладаць ані нашага спосабу мыслення, ані бытавання агранічанага, ня можна ставіць пытання, адкуль Бог узяўся, ані куды ідзе; не дзеля таго, што Бог гэткага пытання баіцца і адказаць ня зможа, але дзеля таго, што гэта праціўна логіцы з нашай стараны, бо калі Бог ёсць быт самаістны, то Ён ня можа пачынацца, ня можа мець канца, мэты і г. д., словам, нашай зямной людзкой меркі да Бога прыкладаць ня можам, людзкім локцем Бога ня змерым, а нашы вельмі мудрыя пытанні: адкуль, нашто, куды — добрыя толькі для гэтага свету, каторы самабытным ня ёсць» [1, с. 8].

З вышэйпрыведзенага матэрыялу бачна, што аўтар у духу аб'ектыўнага ідэалізму падвойвае рэальнасць на самастойнае быццё Абсалюту і другаснае, залежнае існаванне, у якім быццё чалавека падобнае да быцця Абсалюту толькі згодна з прынцыпам аналогіі. У адпаведнасці з тамісцкай тэорыяй гармоніі веры і розуму аўтар пазіцыяніруе немагчымасць пазнання Абсалюту сродкам толькі чалавечага розуму:

«Такім чынам, Бог ёсць тым, што перавышае ўсякую думку людзкую. Каб сабраліся наймагутнейшыя галовы роду чалавечага усіх часоў і мясцоў і запрасілі да сябе ўсіх духаў і раілі над тым, што ёсць Бог — ані ачапіць, ані выразіць ня здолеюць, бо ўсе яны разам не самабытныя, а Бог толькі адзін ёсць каторы самабытны» [1, с. 8].

Абсалют паводле а. Фабіяна Абрантовіча з'яўляецца крыніцай усяго існага:

«Бог ёсць найвышэйшы, найчысцейшы Дух. Бог мае ў сабе жыццё і гэтае жыццё з міласці дае нам, ёсць нашым пачаткам і мэтай» [1, с. 10].

Зыходзячы з вышэй пададзенага матэрыялу, можна зрабіць выснову аб тамісцкай фундзіраванасці анталагічных поглядаў а. Фабіяна Абрантовіча, паводле якой Абсалют існуе як самастойнае быццё, якое з'яўляецца крыніцай тварнага свету. Сама катэгорыя быцця паводле а. Фабіяна Абрантовіча падзяляецца на быццё Абсалюту і свету:

«Светам будзем зваць і праз свет разумець усё, што ёсць, усё рэальнае, усё істнуючае, ці яно будзе целам, ці будзе духам, прыродай, ці надпрыродай, словам усё — што толькі ня ёсць Богам» [3, с. 4].

Рэфлексія над тэмай матэрыяльнага свету прадстаўлена ў працы «Чалавек», абапіраецца на прапанаваны Тамашам Аквінскім прынцып лесвіцы быцця, у аснове якога ляжыць падзяленне свету ў залежнасці ад ступені аддаленасці адносна Абсалюту:

«У гэтак зразумелым свеце ёсць прынамсі пяць клас, пяць груп, на каторыя ўсё рэальнае распадаецца. А яны вось якія: матэрыя нежывая (зямля), матэрыя жывая (расціна), матэрыя з чуццём, свядамасцяй (скаціна, звер), рэальнасць духовая (на-

ша душа, анёлы), рэальнасць вышэйшая над усю прыроду цялесную і духовую (ласка Божая)» [3, с. 4].

З вышэй прыведзеных фактаў вынікае, што анталагічныя погляды а. Фабіяна Абрантовіча фарміраваліся ў рэчышчы тамісцкай традыцыі, яе ідэй і праграмных установак.

Маніфеставаны Тамашам Аквінскім прынцып разгляду Абсалюту ў якасці «esse subsistens» і надалей актыўна выкарыстоўваўся беларускімі прадстаўнікамі. Так, у даваенны час дадзеная тэматыка атрымала далейшае развіццё ў працах **а. Яна Тарасевіча** «Зло і лякарства на яго», «Беларусы ў святле праўды» і **а. Адама Станкевіча** ў «Евангелях і прамовах на нядзелі і святы».

Анталогія а. Яна Тарасевіча пабудавана на ўжо ўзгаданым вышэй прынцыпе разгляду Абсалюту як акта самаіснавання, крыніцы ўсяго існага:

«Бог — гэта самаіснаванне. Я ёсць, што ёсць — адзываецца ён да Маісея. Бог — гэта крыніца жыцця, з якой выплывае жыццё анёлаў, жыццё чалавека і ўсіх істотаў. Дзеля гэтага Ён ёсць стварыцелем неба і зямлі» [4, с. 10].

«Далей, згэтуль ясна нам так-жа, што крыніцай і сялібай праўды ёсць Розум Божы — гэта Крыніца Праўды, з якой кожная праўда выплывае, розум жа людзкі — гэта сяліба створанай праўды» [5, с. 8].

Дадзеная думка яшчэ раз прадстаўлена ў працы «Чалавек — шуканнік Бога», прысвечанай пошуку сэнсу жыцця на зямлі, які, на думку аўтара, магчымы толькі ў лучнасці з Абсалютам:

«У нас аднак большая ёсць прывязанасць да Бога, як да жыцця, бо бяз Бога жыцця быць ня можа, — так як ня можа існаваць рачэй бяз крыніцы, бо ж Бог ёсць Крыніцай жыцця, пачаткам моцы і апошняй мэтай чалавека» [6, с. 6].

Надалей развіваючы анталагічныя погляды, а. Ян Тарасевіч у адпаведнасці з тамісцкай традыцыяй сцвярджае наяўнасць ідэй усяго тварнага свету ў розуме Абсалюту, што знаходзіць пацвярджэнне ў наступных радках дадзенага аўтара:

«Тут пытанне: што такое ёсць праўдай у гэтым выпадку, калі маемо малюнак з аднаго боку, а мастака-маляра з другога? Праўдай тэй ёсць згоднасць абраза з узорам у розуме мастака. Ад мастака-маляра звернемся да Мастака Стварыцеля, да Бога. Бог ёсць Усёмудрым і Усемагутным стварыцелем, мастаком свету. Гэта значыць, што ў ягоным розуме быў ад вякоў вечных узор свету, усіх рэчаў, істот у свеце, сонца, зорак, планет, расцін, жывёлаў, асабліва чалавека і што сваім усемагутным словам ён стварыў з нічога свет паводле свайго вечнага ўзору. Дык звярнуць увагу трэба нам на дзве рэчы: на свет ад вякоў вечных або на ўзор свету ў розуме Божым, і на свет ад пачатку свайго існавання па-за сваім узорам або на абраз таго ўзору. А цяпер: згоднасць гэнага абраза за сваім узорам і ёсць праўдай, якую называюць філёзофы праўдай онтологічнай» [5, с.14].

А. Ян Тарасевіч выкарыстоўвае тэзіс аб прастаце Абсалюту і складанасці тварнага свету:

«У свеце прыродным мы бачым шмат уселякіх рэчаў і істотаў: бачымо рознародныя мінэралы, расціны, звяры, жывёлы. Усе яны і мы самі з імі з'яўляемся рознароднымі ўчаснікамі ў аднэй Праўдзе: адны з іх, гэта значыць, усе безразумныя істоты, ёсць толькі ценем яе, другія-ж, гэта значыць людзі, ёйным абразом...

У свеце ж надпрыродным, у свеце надпрыроднай праўды, у свеце веры святой, такой рознароднасці быць ня можа» [5, с. 19].

Пазначаныя вышэй прынцыпы выкарыстоўвае ў казаннях іншы аўтар — а. Адам Станкевіч. Так, у казанні на V нядзелю посту прысутнічаюць наступныя радкі:

«Ясна, што значаць гэтыя словы! Яны значаць, што Хрыстус ёсць Богам, а як Бог Ён быў, ёсць і будзе. Словы гэтыя кажуць, што Хрыстус як Бог ёсць самай дасканаласцяй, самай праўдай, жыццём самым. Ён безгранічна дасканалы быт. Ён ***ёсць*** (курсіў А. Станкевіча)» [7, с. 3].

Прысутнічае дадзены тэзіс і ў працах аднаго з актыўных дзеячаў беларускага каталіцкага руху, свецкага верніка — Дамініка Анісько. У артыкуле «Чалавек», друкаваным на старонках часопіса «Хрысьціянская думка», адзначаецца:

«І з усяго чалавечага старання тут на зямлі найважнейшае ёсць тое, каб як найбольш прыблізіцца да Бога — да таго самаістнага адвечнага Быту, ад каторага паходзіць усякі быт, каторы даў істненне таксама і чалавеку» [8, с. 1].

Ускосна кранаецца дадзенай праблематыкі Дамінік Анісько ў працы «Усё ў міласці», прысвечанай выкананню прынцыпу хрысціянскай любові ў тварным свеце:

«А тая прадвечная сіла, той Быт прадвечны, самаістны, ад каторага мы тут залежым — гэта Бог. А воля Яго святая — гэта, каб людзі любілі Бога і адны адных» [9, с. 5].

Адначасова з пазначанымі вышэй прынцыпамі для беларускай хрысціянскай думкі каталіцкага напрамку ў XX ст. актуальна традыцыйнае для тамізму палажэнне аб тварным свеце як складаным з'явішчы, якое ёсць толькі недасканалым адлюстраваннем звышрэальнай рэчаіснасці. Доказам гэтаму служаць радкі з артыкула **а. Пятра Татарыновіча**:

«Рэчы матэрыяльныя, жывыя ці нежывыя, арганічныя ці неарганічныя, як гэта называюць іх вучоныя — хоць і маюць у сабе вялікую часціну дасканаласці, хоць і задавольваюць галоўныя, падставовыя пажаданні чалавека, ягонай душы і це-

ла — аднак цалком яго задаволіць ня могуць. Бо няма ні аднэй рэчы на свеце, каторая была-б у поўнай меры добрай, піенкнай, каторая-б ня мела ў сабе ані воднай плямкі зла, ані воднай заганы» [10, с. 5].

У пасляваенны эміграцыйны перыяд тэзіс разгляду Абсалюту ў якасці чыстага акта застаўся актуальным для беларускай думкі каталіцкага напрамку. Дадзенае палажэнне знайшло адлюстраванне ў творчасці такіх аўтараў, як **а. Чэслаў Сіповіч, а. Леў Гарошка**.

А. Чэслаў Сіповіч у працы «Бог», прысвечанай абгрунтаванню існавання Абсалюту з навуковага і рэлігійнага пункту гледжання, разглядае Абсалют у рэчышчы класічнай тамісцкай традыцыі, адзначаючы:

«Існуе сусвет, вялізная машына-будоўля. А дзеля таго, што сусвет ані мог паўстаць сам з сябе, бо нідзе нічога, як кажа дослед, само з сябе не паўстае, толькі з прычыны, дык свет мае сваю прычыну творчую, мае свайго будаўнічага. Тым будаўнічым ня ёсць малпа, ані кракадыл, ані ты, ані я, ані нашы прашчуры, толькі *Той, Хто існуе вечна самастойна* (курсіў а. Чэслава Сіповіча). Да гэткага выснову дайшлі найразумнейшыя філозофы» [11, с. 4].

А. Чэслаў Сіповіч выкарыстоўвае ў працы прынцып абмежаванага крэацыянізму, адзначаючы:

«У створаным свеце ўладае прынцып: тое, што Бог можа асягнуць праз свае стварэнні, таго зноў не стварае. Тады Бог карыстаецца стварэннем як прыладай. Свет — гэта запраўды дзіва Божае мудрасці, у якім выяўленыя сілы і здольнасьці чалавека ў далейшым аднаўляюцца і развіваюцца без таго, каб Бог за кожным разам уваходзіў з сваім новым творчым актам» [12, с. 5]. Надалей дадзены тэзіс больш падрабязна будзе артыкуляваны а. Львом Гарошкам.

А. Леў Гарошка ў рэфлексіі над анталогіяй не кранаецца непасрэдна праблемы азначэння Абсалюту. У цэнтры інтэлектуальных пошукаў дадзенага аўтара знаходзіцца тэматыка ўзаемаадносін Бога і тварнага свету. Прымаючы пад увагу крытыку атэістычнай прапаганды, аўтар імкнецца растлумачыць спосаб кіравання Абсалюту светам. А. Леў Гарошка адзначае, што погляд на кіраванне светам непасрэдна — памылковы, кіраўніцтва светам ажыццяўляецца ўскосна — праз прыродныя законы. Дадзены пункт гледжання ўказвае на тое, што аўтар прытрымліваўся аднаго з найбольш актуальных ужо для неатамізму прынцыпаў — выкарыстанне навукі на карысць тэалогіі:

«А да таго няверуючыя дасьледнікі прыроды і асабліва бязбожніцкія агітатары маюць фальшывае паняцце аб прыродных законах. Яны іх уяўляюць, як штосьці абсалютна ні ад кога незалежнае. А ў сапраўднасці прыродныя законы створаны Богам для кіравання сусветам. А яшчэ больш фальшывым ёсць паняццё няверуючых даследнікаў прыроды аб тым, як рэлігія гаворыць аб Божым кіраўніцтве сусветам. Хрысціянская рэлігія ніколі не казала і ня кажа, што Бог бязупынна ўмешваецца ў быццё сусвету, а якраз так прадстаўляе Бога атэістычная прапаганда. Бог стварыў свет не такім недасканалым, каб трэба было заўсёды ўмешвацца, ці нешта правіць. Зусім не. Разам з матэрыяльным сусветам Бог стварыў таксама прыродныя законы, праз якія Ён кіруе сусветам. Дык ў сапраўднасці ўсе прыродныя законы ўжо сваім існаваннем указваюць на існаванне Заканадаўца — Бога» [13, с. 22].

Адначасова ў духу аб’ектыўнага ідэалізму, фундзіруючы развагі тэзісам аб дуальнасці свету, абумоўленай існаваннем матэрыяльнага і духоўнага пачаткаў, а. Леў Гарошка разглядае працэс знішчэння тварнага свету як наступства разбуральнасці — іманентнай якасці матэрыі, толькі духоўны кампанент выкліканы прыпыніць руйнацкую дзейнасць:

«У гэтым свеце ёсць зусім нармальным з’явішчам, што кожная матэрыяльная рэч старэецца, зужываецца і нішчыцца. Але ўсюды там, дзе ў матэрыі праяўляецца дзеянне духовае сілы, руйнацкі працэс да пэўнае ступені абмяжоўваецца» [14, с. 1].

Тэндэнцыяй выкарыстання навуковых дасягненняў дзеля абгрунтавання тэалогіі, а менавіта — палажэння крэацыянізму, прасякнута ўся творчасць а. Льва Гарошкі. Так, у артыкуле «Суператамная бомба» аўтар пад псеўданімам Т. Малько адзначае:

«Калі такая моцная сіла захаваная ў атоме, дык якая мусіць быць тая сіла, якая знайходзіцца па-за атомам, але якая накіравала сваю энэргію на тварэнне атомаў?! Фізіка адмаўляецца шукаць яе, хэмікі — ня маюць магчымасці, а іншыя прыродазнаўчыя навукоўцы адказваюць, што гэта не належыць да абсягу іхніх доследаў. Аднак знайсці гэтую сілу вельмі важна, бо калі такая магутная энэргія знаходзіцца ў атоме, дык якая-ж мусіць быць энэргія ў той крыніцы, адкуль гэтая энэргія пералілася ў атом?! І якая аграмадная тая сіла, якая змусіла яе пераліцца?!

Адказ на гэтыя пытанні сапраўды не належыць да абсягу прыродазнаўчых навук, але затое ёсць іншыя навукі як: філязофія і багасловія, якія, кажуць, ужо даўно адказалі на вышэйпастаўленыя пытанні. Гэтыя навукі кажуць, што першапачатковаю крыніцаю ўсяе энэргіі, якая існуе на свеце, а тым самым і ў атоме, ёсць усемагутны Бог, а сілаю, якая выклікала тварэнне атомаў, ёсць бясконцая Божая любоў» [15, с. 7].

Падобныя развагі прапанаваны чытачу ў артыкуле «Сляды Бога ў прыродзе»:

«Гэты факт з усёй навуковай дакладнасцю сцвярджаецца пры разбіцці атаму. Доследамі сцверджана, што, разбіўшы атам, ад матэрыі не астаецца нічога — яна ператвараецца ў нематэрыяльную энэргію. Разбіўшы атам, тым самым вучоныя разбілі ў пух навучны матэрыялізм, які асноўваўся на вечнасці і незнішчальнасці матэрыі. Тое, што матэрыя змяняецца ў энэргію падчас разбіцця атаму, для матэрыялізму мала пацяшаючы факт, бо калі-б гэтую выладаваную энэргію нехта захацеў зноў ператварыць у матэрыю, дык дзеля гэтага мусіў-бы затраціць дастаткова шмат энэргіі на сам працэс ператварэння. Аднак гэты працэс калісьці мусіў адбывацца і была Усемагутная Сіла, якая мела энэргію, патрэбную для творчага акту» [16, с. 7].

Такім чынам, згодна прыведзенаму факталагічнаму матэрыялу трэба зрабіць наступныя высновы: анталагічныя погляды беларускіх прадстаўнікоў хрысціянскай плыні каталіцкага кірунку ў XX ст. фарміраваліся ў межах рэчышча тамісцкай сістэмы, што ўвасобілася ў прынцыпах разгляду Абсалюту ў якасці акта самаіснавання і крыніцы ўсяго існага — найбольш характэрнай рысы вучэння Тамаша Аквінскага, разгляду тварнага свету ў якасці другаснага, складанага, імпліцытнай рысай якога ёсць тэмпаральнасць, выкарыстанне пры аналізе мадэлі свету т. зв. «лесвіцы тамізму». Асабліва звяртае ўвагу выкарыстанне ўжо ў пасляваенны перыяд навуковых адкрыццяў на карысць тэалогіі — рыса, характэрная для руху неатамізму. Усё вышэйсказанае дазваляе сцвярджаць аб наяўнасці тамісцкай традыцыі ў анталагічным аспекце ў творчасці такіх аўтараў, як а. Фабіян Абрантовіч, а. Ян Тарасевіч, а. Адам Станкевіч, Дамінік Анісько, а. Леў Гарошка, а. Чэслаў Сіповіч.

## Спіс цытаваных крыніц


1. *Абрантовіч, Ф.* Бог / Ф. Абрантовіч. — Вільня, 1928.
2. The 24 thomistic theses [Electronic resource]. — 2009. — Mode of access : www.catholicapologetics.info. — Date of access: 25.11.2011.
3. *Абрантовіч, Ф.* Чалавек / Ф. Абрантовіч. — Вільня, 1928.
4. *Тарасевіч, Я.* Зло і лякарства на яго / Я. Тарасевіч. — Вільня, 1932.
5. *Тарасевіч, Я.* Беларусы ў сьвятле праўды / Я. Тарасевіч. — Вільня, 1935.
6. *Тарасевіч, Я.* Чалавек — шуканнік Бога / Я. Тарасевіч // Хрысціянская думка. — 1933. — № 2. — С. 2–7.
7. *Станкевіч, А.* Лекцыя, Евангелля і Навука на V нядзелю посту / А. Станкевіч // Хрысціянская думка. — 1929. — № 5. — С. 3.
8. *Анісько, Д.* Чалавек / Д. Анісько // Хрысціянская думка. — 1929. — № 14. — С. 1.
9. *Анісько, Д.* Усё ў міласьці / Д. Анісько // Хрысціянская думка. — 1933. — № 5. — С. 2—5.
10. *Татарыновіч, П.* Зямное шчасце — водблеск праўдзівага шчасця / П. Татарыновіч // Хрысціянская думка. — 1928. — № 4. — С. 3—7.
11. *Сіповіч, Ч.* (*Друя Васіль*). Бог / Ч. Сіповіч (Друя Васіль) // Зьніч. — 1951. — № 4—5. — С. 3—4.
12. *Сіповіч, Ч.* (*Друя Васіль*). Ты і яна / Ч. Сіповіч (Друя Васіль) // Божым шляхам. — 1950. — № 1. — С. 5—9.
13. *Гарошка, Л.* Навука і рэлігія / Л. Гарошка. — Рым, 1977.
14. *Гарошка, Л.* Вечна новае / Л. Гарошка // Божым шляхам. — 1952. — № 47. — С. 1.
15. *Гарошка, Л.* (*Малько Т.*). Суператамная бомба / Л. Гарошка (Малько Т.) // Божым шляхам. — 1951. — № 4. — С. 7.
16. *Гарошка, Л.* (*Сьвятар Л.*). Сьляды Бога ў прыродзе / Л. Гарошка (Сьвятар Л.) // Божым шляхам. — 1949. — № 7—8. — С. 7.


*Дата поступления в редакцию: 20.05.2012 г.*